Кошт 2 руб.

*Пралетарыі усіх краеу, злучайцеся*

# Савецкая Беларусь

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Менск, Літэрацка-выдавецкі аддзел Палітычнага ўпраўленьня Заходняга хронту.

Выданьне Рэукому Сацыялістскай Савецкай Рэспублікі Беларусі.

№ 27 (37). Серада, 15-га верасьня 1920 г.

## Сьпячы прачнуўся.

Вядомы расейскі пісьменьнік Лермантаў калісьці так выказаўся ў сваім вершы аб становішчы ўсходніх краёў:

„Усё, што ўкол абачна веку, Сьпіць, цанячы спакой“.

Адсталые, не прасьвячоные народы Азіі, сапраўды доўгі час аставаліся нярухомымі, нібы спаўшымі. Ні палітычнага, ні грамадзянскага руху яны ня зналі да апошніх часоў.

Карыстаючы з гэтага, хітрая і пранозватая буржуазея, капіталісты і багацеі Англіі і часткаю іншых краёў паціхэнькі ды памаленьку налажылі на іх сваю руку.

Адзін за другім цэлы цуг усходніх краёў такім чынам патпаў пад уладу буржуйскае Англіі і Францыі Індыя, Пэрсія Аўганістан, Бухара зрабіліся каленіямі невялічкае сама па сабе ангельскае іставы і доўгіе гады служылі як багацеям вялікім скарбам даходаў. Працоўны народ соткамі мільёнаў стагнаў у прыгону ангельскіх жывадзёраў, ня знаючы прасьветлае хвіліны, ня маючы ўласнага жыцьця.

За апошніе гады пасьля вайны прыгон гэты ўсё крапчэў і ўмацоўваўся: зьнішчанае доўгаю вайною гаспадарскае і прамысловае жыцьцё капіталістскіх гасударстваў Эўропы награжае вялікім няшчасьцем спакойнаму і задавольнаму жыцьцю іх буржуазеі. Вось каб прадсьперагчыся ад выразнай пагібелі, ангельская і французкая буржуазея і налягла найболей на свае каленіі, прагучыся высасаць у падняволеных сабе народаў астатніе сокі.

Але ў гэтай свае працы ёй прышлося наткнуцца на сапраціўленьне. Народы Усходніх краёў не змаглі далей пакорна маўчаць і паднялі паўстаньне супроціў сваіх прыгнятацеляў. Турцыя, Пэрсія, Індыя і іншые зарухалі, заварушыліся і, азіраючыся на Савецкую Расею, парашылі скінуць з сябе векавы прыгон, нацыянальны і клясавы.

З кожным днём гэта рашэньне іх робіцца цьвярдзейшым і магутнейшым. З кожным днём яно ўваходзіць у болей стройные і з'арганізованые формы. І кожны дзень яно ўзрастае ў сіле. Дагэтуль у кожнай краіне працоўны народ вёў барацьбу з прыгнятацелямі па свойму і асобна ад другога. Турэцкіе паўстанцы рабілі адно, а пэрсідзкіе другое—ня маючы аднаго пляну.

Цяпер само жыцьцё вымусіла апляпаваць і зьліць змаганьня працоўных народаў усходніх краёў з ангельскай, французкай і сваей ўласнай буржуазеяй у адно русло. Дзеля гэтага ў Баку надоечы адчыніўся з'езд усходніх народаў. На з'езд сабралося да двух тысячаў прадстаўнікоў народаў Індыі, Пэрсіі, Турцыі, Азэрбэйджану, Аўганістану і іншых. Усе дэлегаты настроены на баявы і рэвалюцыйны лад. З'езд пастанавіў зрабіць цеснэю злуку з Савецкаю Расеяй і пад яе кіраўніцтвам дабівацца запанаваньня Савецкага строю ў краёх на ўсім Усходзе. Да голасу з'езду прыслухоўваецца мільёны працоўных людзеў, якіе чакаюць скарэйшага вызваленьня ад прыгону векавых абірацеляў-рапакоў Англіі і Францыі.

З другога боку, да з'езду трывожна прыслухоўваецца і буржуазея ўсяго сьвету наагул і ангельская ў асобку. Прыслухоўваецца і млее ў бясьсільлі затушыць той вялізарны касьцёр рэвалюцыі, які загараецца на Ўсходзе, пагражаючы перакінуць сваё полымя і на Заходнюю Эўропу і на ўвесь сьвет. Сьпячы прачынаецца!

Так будзіць хваля рэвалюцыі ўсюды той мяртвяцкі спакой, аб якім пісаў Лермантаў і які даў магу прагучай крыві і поту буржуазеі захапіць у свае рукі ўвесь працоўны народ усходніх краёў. І хутка-хутка ўжо замест яго запануе сьвяточная трывога агульнай рэвалюцыі, якая прынясе новы спакой кіпучага будаўніцтва сацыялізму.

**З. Жылуновіч.**

## Абарона Савецкіх Рэспублік.

*(Вестки с хронту, адтрыманные ад Палявога Штабу Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету Рэспублікі за 13-е верасьня).*

### Заходні хронт.

**У Гарадзенскай ваколіцы мы занялі рад сяленьняў у 18 вярстох заходней і 22 вярстох паўдзёньней Горадні.**

**У Берасьцейскай ваколіцы ідуць бойкі ў районе Кобрыну.**

**На Заходнім Бугу на вучастку Уладава—Совая ідуць упартые бойкі.**

### Паудзенны хронт.

**У Львоўскай і Рагацінскай ваколіцах ідуць упартые бойкі.**

## Вакол вайны і міру.

### Мірные перагаворы

**Польскі міністар заграмічных спраў князь Сапега паведаміў Народнага Камісара Заграцічных спраў т. Чычэрына, што польская мірная дэлегацыя выяжджае з Варшавы 14-га верасьня і прыбудзе ў Рыгу 16-га верасьня. Склад яе даўнейшы.**

—

### Зацьвярджэньне мірнага дагавору.

Латвійскі Ўстаноўны Сойм 2 верасьня аднагалосна зацьвердзіў мірны дагавор з Расеяй.

—

### Новые каманьдзеры.

Ангельскіе газэты паведамляюць, што з другой палове жніўня ўсе польскіе хронты падчынены каманадаваньню афіцэраў гэнэральнага штабу Антанты.

—

### Наступленьне савецкіх войск.

Як паведамляе літоўская газэта „Літва“, савецкіе войскі адтрымалі новую значную падмогу і пачалі наступленьне. Шмат войска было скіравана ў кірунку Сувалкі—Аўгустоў. Новае наступленьне Чырвонай арміі Горадня—Аўгустоў.

—

### Канец блізка.

Румынскіе газэты пішуць аб вайсковай дзейнасьці Урангэля. Яны кажуць, што ня трэба быць праракам, каб угадаць, што лёс Ўрангэля нічым ня будзе розьніцца ад лёсу Дэнікіна і Калчака. Якіе-б Ўрангэль сілы ні ўпатрабляў, яму ня ўдаецца затрымаць націску бальшавікоў.

—

### Французкіе інструктары у польскай арміі.

Гэтымі днямі прыехалі ў Львоў некалькі дзясяткаў французскіх афіцэраў гэнэральнага штабу і вышэйшых інструктароў, каторые зараз адправіліся на хронт і былі залічаны на работу ў штабах польскай арміі, дзе яны кіруюць фортыфікацыйнай работай і ўзмацаваньнем франтавых ліній.

—

### Дорага каштуе.

Заграцічные газэты паведамляюць, што чарнасотніцкая Вэнгрыя пасылае свае войскі на помач Польшчы, адтрымаўшы за гэта Трансыльванію з гарадамі Аргая і Марэ. Вэнгэрскіе войскі быццам ужо знаходзяцца ў радох польскіх войск у Галіччыне.

—

### Банды Урангэля уцякаюць.

Газэта „Военный Голос“ стану арміі Ўрангэля піша, што моладзь уцякае ескладу арміі.

